МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
220004, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА - КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

15.04.2015 г. №11-01-01/4

Гродзенскі раённы
выканаўчы камітэт

**4. Аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека**

4.1. Па выніках разгляду элемента "Рэгіянальная традыцыйная кухня" ў аграгарадку Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці, з улікам яго адпаведнасці крытэрыям, вызначаным абзацам другім падпункта 1.1 пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь", ВЫРАШЫЛІ:

4.1.1. прыняць да ўвагі, што традыцыйная кухня аграгарадка Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці ўтварае комплекс, у склад якога ўваходзяць паўсядзённыя (бабка і кішка бульбяныя, жытні хлеб), святочныя ("кацяціны", "бігас", "цымас", сыр клінковы) і абрадавыя ("ламанцы") стравы;

4.1.2. адзначыць, што разглядаемы элемент нематэрыяльнага праяўлення творчасці чалавека "Рэгіянальная традыцыйная кухня" ў аграгарадку Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці вызначаецца:

тэхналогіяй прыгатавання, якая грунтуецца на старадаўніх традыцыях, з'яўляецца жывой унікальнай праявай лакальнай культуры;

носьбіты традыцыі гатуюць традыцыйныя стравы для паўсядзённага, абрадавага і святочнага ўласнага ўжывання;

працэс прыгатавання мясцовых традыцыйных страў складаецца з пэўных этапаў, заснаваных на старажытнай тэхналогіі, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне дзякуючы мясцовай сістэме культуры;

4.1.3. лічыць неабходным наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека – "Рэгіянальная традыцыйная кухня" ў аграгарадку Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці з наданнем катэгорыі "Б".

Старшыня НМР
Намеснік Міністра — А.А.Яцко